## ТЭМА 4. ЕЎРАПЕЙСКІ РЭГІЁН У СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ

1. Палітычная карта Еўропы ў Раннім сярэднявеччы.
2. Палітычная карта Еўропы ў Высокім і Познім сярэднявеччы.
3. Этнаканфесійная карта Еўропы ў сярэднявеччы.
4. Эканамічная геаграфія сярэдневяковай Еўропы.

**Літаратура**

Агеева, Р.А. Страны и народы: происхождение названий/ Р.А. Агеева. - М.,1999.
Кертман, Л. Е. География, история и культура Англии/ Л.Е. Кертман. - М., 1979.
Магидович, И. П., Магидович, В. И. История открытия и исследования Европы – М., 1970.
Максаковский, В.П. Историческая география мира/ В.П. Максаковский. - М., 1997.
Мурзаев, Э.М. География в названиях/ Э.М. Мурзаев. - М., 1982.
Самаркин, В.В. Историческая география Западной Европы в средние века/ В.В. Самаркін. – М., 1976.

**1. Палітычная карта Еўропы ў Раннім сярэднявеччы.** Ранняе сярэднявечча – эпоха германскіх "варварскіх" каралеўстваў. У выніку падзення Заходняй Рымскай імперыі на яе тэрыторыі ўтварыўся шэраг дзяржаў германцаў. Такімі дзяржавамі сталі *каралеўствы вестготаў* на Пірэнейскім паўвостраве і ў Аквітаніі, *свеваў* на паўночным захадзе Пірэнеяў, *бургундаў* на ўсходзе Галіі, *вандалаў* (алана-вандальскае) на Поўначы Афрыкі, *дзяржава Адаакра* і *каралеўства остготаў* на Апенінскім паўвостраве. Значна пазней утварылася *каралеўства лангабардаў*. На пазарымскіх тэрыторыях утвараліся іншыя варварскія дзяржавы, напрыклад *Гунскі каганат*, а пазней *Аварскі каганат*.

У выніку германскай экспансіі ў рымскую правінцыю Брытанія, пераважная яе частка была захоплена *плямёнамі англаў, саксаў, ютаў і фрызаў*, якія заснавалі тут свае дзяржавы. Англасаксонскія каралеўствы ў Брытаніі: *Уэсэкс, Сасэкс, Мідлсэкс, Эсэкс, Усходняя Англія, Ліндсей, Берніцыя, Дэйра, Нартумбрыя, Мерсія, Кент*. Аўтахтоннае брыцкае насельніцтва вымушана было або мігрыраваць на паўвостраў Арморыка (зараз Брэтань), або адысці на захад вострава (паўвостраў Уэльс), дзе яны заснавалі свае дзяржавы. Дзяржавамі брытаў былі *Дамноня, Карнубія, Стратклуд, Кумбрыя*. З Ірландыі на Брытанію абрынуліся *скоты*, якія здолелі заснаваць на землях піктаў сваю дзяржаву - *Дал Рыяду*. У VI ст. у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Брытаніі пачынаецца перыяд гептархіі, калі адначасова суіснавала сем англасаксонскіх дзяржаў: *Уэсэкс, Сасэкс, Эсэкс, Усходняя Англія, Нартумбрыя, Мерсія, Кент*. У выніку уварвання вікінгаў у IX ст. на ўсходзе Брытаніі ўтварылася асобая зона, якая атрымала назву *Дэнло* або Данэлаг.

Найбольш значную ролю ў сярод германскіх каралеўстваў адыграла *Франкская дзяржава*, якая ў раннім сярэднявеччы здолела пераўтварыцца з варварскага каралеўства ў імперыю. Паступова ў Франкскай дзяржаве сфарміраваліся новыя геаграфічныя рэгіёны - *Нейстрыя Аўстразія, Бургундыя і Аквітанія*. У IX ст. Франкская імперыя распалася, пакінуўшы пасля сябе *Заходнефранкскае каралеўства*, якое стала базісам для фарміравання *Французскага каралеўства*; *Усходнефранкскае каралеўства* – аснову будучага *Германскага каралеўства*; *Латарынгію*, якая ў сваю чаргу распалася на *Арэлацкае каралеўства, Каралеўства Італію* і іншыя дробныя феадальныя дзяржавы.

На тэрыторыі *Ўсходняй Рымскай імперыі* праходзілі іншыя дзяржаўна-палітычныя працэсы, якія прывялі да афармлення *Рамейскай імперыі*, больш вядомай як Візантыя, як спадчыніцы Рымскай імперы. У VI ст. адбылося максімальна вялікае ў яе гісторыі тэрытарыяльнае пашырэнне, але ў наступным ў сувязі са славянскай і арабскай экспансіяй Візантыйская тэрыторыя рэзка звузілася.

У раннім сярэднявеччы пачаўся працэс афармлення першых славянскіх дзяржаў: *дзяржавы Само* і *Першага Балгарскага царства*, пазней *Вялікамараўскай дзяржавы, Чэхіі, Польшчы, Сербіі, Харватыі і Рускай дзяржавы*.

**2. Палітычная карта Еўропы ў Высокім і Познім сярэднявеччы.**

Пасля падзелу Франкскай дзяржавы адным з найбольш значных дзяржаўных утварэнняў Еўропы стала *Германскае каралеўства*, якое ўтварылася на аснове Ўсходнефранкскае каралеўства. Германія складалася з буйных герцагстваў, якія сфарміраваліся на племянной аснове: *Саксонія, Франконія, Латарынгія, Швабія (Алеманія), Баварыя, Цюрынгія*. У X ст. германскія імператары паставілі пад свой кантроль Бургундыю і значную частку Італіі, у выніку чаго сфарміравалася новая дзяржава з імперскім статусам – *Свяшчэнная Рымская імперыя* (германскай нацыі). Адзначым, што адначасова ў Паўднёва-Ўсходняй Еўропе існавала яшчэ адна “рымская” імперыя – Візантыя. Структурна ў Свяшчэнную Рымскую імперыю ў розныя перыяды ўваходзілі *каралеўствы Германія, Італія, Бургундыя, Чэхія* і іншыя феадальныя дзяржавы. Нямецкія рыцары праводзілі актыўную экспансію ва ўсходнім накірунку, у выніку чаго на захопленых славянскіх, балцкіх і эстонскіх землях афармляліся германскія феадальныя дзяржавы: *марка Білунгаў, Паўночная, Лужыцкая, Мейсенская, Мерзебургская і Цэйцкая маркі;*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Брандэнбург, Мекленбург, Памеранія, Тэўтонскі ордэн і ордэн Мечаносцаў (Інфлянцкі)*. Паступова Германія распалася на шэраг суверэнных дзяржаў сярод якіх у канцы сярэднявечча найбольш значнымі былі *Браўншвейг-Люнэбург, Гальштэйн, Альдэнбург, арцыбіскупства Брэмен, герцагства Латарынгія, графства Саксонія і курфюршэства Саксонія, ладграфства Гесэн, Насаў, Пфальц, графства Вюртэмберг, герцагства Баварыя, Ціроль, Карынція, Штрыя, герцагства Аўстрыя, герцагства Крайна*. У паўночна-заходнім рэгіёне германскага свету сфарміраваўся гістарычна і культурна цэласны рэгіён які стаў называцца *Нідэрланды* (Ніжнія землі). Нідэрланды складаліся з герцагстваў і графстваў *Фрысландыя, Утрэхт, Галандыя, Зеландыя, Гелдэрн, Брабант, Генегаў, Люксембург*. Сваеасаблівасцю Германіі з'яўляецца афармленне гарадскіх саюзаў, такіх як *Рэйнскі і Швабскі саюзы*, а таксама *Ганза*.

*Французскае каралеўства*, як і Германія ў пачатку высокага сярэднявечча распадалася на шэраг феадальных даменаў. *Іль-дэ-Франс, герцагствы і графствы Брэтань, Турэнь, Мэн, Анжу, Пуату, Нармандыя, Валуа, Шампань, Пікардыя, Артуа, Фландрыя. Гіень, Бурбон, Ангулем, Гасконь, Тулузскае графства, Праванс, Дафінэ, герцагства Бургундыя, графства Бургундыя (Франш-Кантэ).* У эканоміка-геаграфічным і культурна-гістарычным планах Французскае каралеўства падзялялася на дзве вялікі зоны - *Лангедойль* на поўнач ад ракі Луара і *Лангедок* на поўдзень ад яе.

На тэрыторыі Брытаніі ў працэсе барацьбы з вікінгамі (нарманамі) на аснове Ўэсэкса ўтварылася адзіная *Англійская дзяржава*. На поўначы вострава дзяржава скотаў Дал Рыяда эвалюцыяніравала ў *Шатландскае каралеўства*. На тэрыторыі Ірландыі ўтварылася *Ірландская дзяржава*.

Паўночная Еўропа. У Скандынаўскім рэгіёне ў сярэднявеччы праходзіў працэс афармлення *Дацкага* і *Нарвежскага каралеўстваў*. У працэсе фарміравання *Шведскага каралеўства* важную ролю адыгралі такія рэгіёны як *Эстэргётланд, Вестэргётланд* і *Свеаланд*. Важную ролю ў жыцці скандынаўскіх народаў адыгрываў рэгіён *Сконэ*. У выніку экспансіі вікінгаў у Заходнюю і Ўсходнюю Еўропу пры актыўным удзеле нарманаў былі створаны такія дзяржаўныя ўтварэнні як *Нармандыя* ў Францыі, *Данелаг* (Дэнло) ў Брытаніі, *Сіцылійскае каралеўства* ў Італіі, *Руская дзяржава* ва Ўсходняй Еўропе. У 1397 г. Данія, Нарвегія і Швецыя былі аб'яднаны ў межах *Кальмарскай уніі*.

Паўднёвая Еўропа. На Пірэнейскім паўвостраве пасля падзення Вестгоцкага каралеўства пад ударамі арабаў яго спадчыннікам стала каралеўства *Астурыя*, на базе якога сфарміраваліся такія дзяржавы як *Галісія, Леон і Кастылія*. Паступова з *Леонскай дзяржавы* адбылося вылучэнне *Партугальскага графства*. З утворанай франкамі *Іспанскай маркі*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

сфарміраваліся *Барселонскае графства* (Каталонія), *Арагон, Навара*. У 1247 г. у выніку заключэння асабістай уніі Каталонія фактычна ўвайшла ў склад Арагона. Значна пазней, у 1479 г. была заключана Кастыльска-Арагонская ўнія, што паступова прывяло да фарміравання адзінай *Іспанскай дзяржавы*.

У паўночнай частцы Апенінскага паўвострава адбываецца распад *Каралеўства Італія*. Для гэтага рэгіёна характэрна раздробленасць, найбольш важную ролю адыгрывалі такія дзяржавы як маркграфствы *Тасканскае* і *Верона*, *Царкоўная дзяржава*, *герцагствы Спалета і Беневента, княства Салерна, графства Савойя, герцагства Мілан, рэспублікі Венецыя, Генуя, Лука, Піза, Сіена, Фларэнцыя*, *Аквілейскі патрыярхат*. На поўдні Апенінаў пад уплывам нарманаў афармілася *Сіцылійскае каралеўства*. У XIV ст. з яго складу выйшла *Неапалетанскае каралеўства*.

Дзяржаўна-палітычнае становішча ва Усходняй і Паўднёва-Ўсходняй Еўропе. У X ст адбываецца працэс фарміравання *Венгерскага каралеўства*. У нізоўях Дуная утварыліся *Малдаўскае* і *Валаскае княствы* (Цара Рамынянска). У 1204 г. пад ударамі крыжакоў пала Візантыйская імперыя, на месцы якой пераможцы стварылі *Лацінскую імперыю*, а таксама фактычна незалежныя ад яе *Фесаланікійскае каралеўства*, *Афінскае герцагства, Ахейскае княства, Неграпонта* і *Герцагства Архіпелага* (Наксас). На незахопленых візантыйскіх землях сфарміраваліся *Нікейская, Трапезундская імперыі* і *Эпір*. У жорсткай барацьбе нікейскія імператары ў 1261 г. знішчылі Лацінскую імперыю і адрадзілі Візантыю. Сур'ёзныя тэрытарыяльныя змены адбыліся ў Паўднёва-Ўсходняй Еўропе ў сувязі з асманскай экспансіяй. Асманы захапілі Сербію, Балгарыю, Візантыю і значную частку Венгрыі.

Ва Ўсходняй Еўропе ў высокім сярэднявеччы адбываецца распад Рускай дзяржавы, вылучаюцца такія княствы як *Галіцка-Валынскае, Кіеўскае, Уладзіміра-Суздальскае, Наўгародскую* і *Пскоўскую землі*. На тэрыторыі сучаснай Беларусі афарміліся *Полацкае* і *Тураўскае княствы*. У выніку мангола-татарскага нашэсця ў сярэдзіне XIII ст. значная частка рускіх зямель апынулася пад кантролем *Залатой Арды*, у той жа час на захадзе рускіх зямель пачаўся працэс фарміравання Літоўска-Рускай дзяржавы. Па меры тэрытарыяльнага росту *Вялікага княства Літоўскага і Рускага* захопленыя мангола-татарскімі заваёўнікамі землі сучаснай Беларусі і Ўкраіны вызваляліся. На застаўшыхся пад уладай мангола-татараў рускіх землях у жорсткай міжусобнай барацьбе сфарміравалася *Вялікае княства Маскоўскае*, якое стала галоўным канкурэнтам Вялікаму княству Літоўскаму ў справе "збірання" зямель былой Кіеўскай Русі.

У выніку крыжовага руху ў канцы XI ст. пачаўся працэс афармлення дзяржаў крыжакоў па-за межамі Еўропы - на Ўсходзе: *Іерусалімскае каралеўства, графствы Эдэсса* і *Трыпалі, княства Антыёхія*. У канцы XII ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

аформілася *Кіпрскае каралеўства*. Усе яны зніклі пад ударамі мусульманскіх дзяржаў да канца сярэднявечча.

**3. Этнарэлігійная карта Еўропы ў сярэднявеччы.** На пачатку сярэднявечча ў Еўропе пражывала каля 35 млн. чалавек. Ужо да Вялікага перасялення народаў тут праходзілі сур’ёзныя этнічныя змены. У выніку пашырэння Рымскай імперыі на пачатку новай эры значнай раманізацыі падвергнулася кельцкае насельніцтва Галіі і Іспаніі. Племянная структура паступова знікала, а разам з тым знікалі і такія народы як белгі, лузітаны і г.д. Аднак працэс асіміляцыі рымлянамі падпарадкаваных народаў праходзіў не ўсюды аднолькава. На тэрыторыі Брытаніі моўнай асіміляцыі не адбылося, брыты захаваліся як асобны этнас, хаця і адчулі на сабе моцны рымскі ўплыў у гаспадарчым, культурна-рэлігійным жыцці і г.д. Па-за рамкамі асіміляцыі засталіся і народы, якія мелі даўнюю культурную традыцыю, напрыклад грэкі. Бліжэйшымі суседзямі Рымскай імперыі былі германцы, ціск якіх усё больш узмацняўся. Менавіта з прарывам германцаў на рымскія землі і звязаны закат старажытнай рымскай дзяржаўнасці. На тэрыторыі Галіі рассяліліся франкі, вестготы і бургунды. У Іспаніі абасноваліся вестготы, свевы і аланы, якія, дарэчы, мелі іранскае паходжанне. На тэрыторыі Італіі рассяліліся остготы. У 5 ст. на тэрыторыю Брытаніі абрынуліся саксы, англы, юты і фрызы. Германцы пачалі барацьбу адно з адным, у выніку чаго франкі выцеснілі вестготаў з Акітаніі, а вестготы, у сваю чаргу, выцеснілі вандалаў з Іспаніі ў Афрыку. Лангабарды знішчылі дзяржаву остготаў і рассяліліся на поўначы Італіі. Адначасова з германскай экспансіяй на захад, на ўсход і паўночны ўсход пачалі рух славяне. На поўдні славяне актыўна асімілявалі мясцовае балканскае насельніцтва, а на ўсходзе балтаў і фіна-ўграў.

У высокім сярэднявеччы распачаўся працэс фарміравання еўрапейскіх народнасцей, сярод якіх на захадзе можна выдзеліць дзве асноўных групы: раманцы і германцы. У выніку асіміляцыйных працэсаў на тэрыторыі Нейстрыі, Аквітаніі і Бургундыі, германскія плямёны франкаў і бургундаў паступова растварыліся ў асяродку раманізаваных кельтаў, у выніку чаго пачаўся працэс афармлення паўночнафранцузскай і паўднёвафранцузскай (правансальскай) народнасцей. Падобныя працэсы праходзілі на Пірэнейскім паўвостраве, дзе вестготы і свевы былі асіміляваны мясцовым раманізаваным кельцкім і іберыйскім насельніцтвам, у выніку чаго пачалі афармляцца кастыльская, арагонская, каталонская, галісійская народнасці. У Брытаніі ў выніку паступовага збліжэння германскіх плямён (пры ўдзеле скандынаваў) і мясцовага кельцкага насельніцтва праходзіла фарміраванне англійскай народнасці. З XI ст. на гэты працэс аказала істотны ўплыў панаванне ў палітычным і культурным жыцці паўночнафранцузскай эліты. Племянная і феадальная раздробленнасць значна перашкаджала, але не спыніла працэса

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

фарміравання нямецкай народнасці. У Скандынаўскім субрэгіёне праходзіў працэс утварэння дацкай, нарвежскай і шведскай народнасцей. Наяўнасць дзяржаўнасці спрыяла працэсу афармлення шэрагу славянскіх народнасцей: польскай, чэшскай, сербскай, харвацкай, балгарскай, рускай (старажытнарускай). З апошняй, дарэчы, пасля падзелу старажытнарускага арэала на часткі падкантрольныя Вялікаму княству Літоўскаму і Залатой Ардзе, выдзеліліся старабеларуская, стараўкраінская і руская народнасць Маскоўскай дзяржавы. У Візантыйскай імперыі, дзе аснову складаў грэчаскі этнас, нягледзячы на папулярнасць палітоніма "рамей", адзінай візантыйскай народнасці так і не склалася.

Нягледзячы на шэраг эпідэмій, напрыканцы сярэднявечча насельніцтва Еўропы налічвала каля 90 млн. чалавек. Найбольш шчыльна былі заселены тэрыторыі Нідэрландаў, парэйнскай Германіі, Францыя, Паўночная і Сярэдняя Італія, еўрапейская частка Візантыі. Міграцыйныя плыні паступова змяняліся. Калі ў раннім сярэднявеччы вектар быў з з усходу на захад, звязаны з ўварваннем гунаў, авараў, венграў і з поўначы на поўдзень, што тлумачылася германскай міграцыяй на тэрыторыю Рымскай імперыі і экспансіяй вікінгаў. У высокім і познім сярэднявеччы назіраецца кірунак з захаду на ўсход, звяны з германскай экспансіяй на славянскія і балцкія землі, а таксама спробамі вярнуць у еўрапейскі свет страчаныя ў раннім сярэднявеччы тэрыторыі. Гэта найбольш ясрава праявілася ў выглядзе крыжовых паходаў на Ўсход і Рэканкісце.

Да падзення Заходный Рымскай імперыі на тэрыторыі гэтай дзяржавы панавала хрысціянства. З IV ст. хрысціянства, праўда ў арыянскай форме, стала распаўсюджвацца ў германскім свеце. Да канца VI ст. ўсе германскія плямёны, якія засялілі тэрыторыю былой Заходняй Рымскай імперыі ўспрынялі арыянства (за выключэннем франкаў, а таксама магчыма бургундаў і свеваў, якія ўспрынялі артадаксальнае хрысціянства). У VII-IX ст. былі хрысціянізаваны бавары, цюрынгі, швабы, саксы, англасаксы. У высокім сярэднявеччы была хрысціянізавана практычна ўся Еўропа. Але межы хрысціянскага рэгіёна былі рухомымі. Адначасова з выцясненнем хрысціянствам паганства ў паўночным накірунку, само хрысціянства паступова выцяснялася ісламам у такіх традыцыйных раёнах як Блізкі Ўсход, Паўночная Афрыка, Пірэнейскі паўвостраў. Раскол хрысціянства ў 1054 г. на дзве плыні - рыма-каталіцкую і грэка-праваслаўную значна аслабіла пазіцыі гэтай рэлігіі на ўсходзе. Спробы хрысціян вярнуць страчаныя рэгіены, якія праявіліся ў выглядзе Рэканкісты ў Іспаніі і крыжовага руху на Ўсход, былі паспяховымі толькі часткова.

**4. Сацыяльна-эканамічная геаграфія сярэдневяковай Еўропы.** Асновай эканомікі сярэдневяковых дзяржаў была сельская гаспадарка. У

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

раннім сярэднявеччы найбольш развітым сельскагаспадарчым рэгіёнам працягвала з'яўляцца Міжземнамор'е. Тут актыўна выкарыстоўвалася ворнае земляробства, было развіта садаводства, вінаградарства. Вялікіх поспехаў дасягнула жывёлагадоўля. Паступова ворыўнае земляробства распаўсюдзілася паўсюдна. Адбываецца паступовы пераход ад двухполля да трохполля, а ў канцы XV ст. у Італіі распаўсюджваецца шматполле.

Сярэднеяковы горад сам забяспечваў сябе ўсім неабходным. Нягледзячы на неаднароднасць яго планіроўкі ён прынцыпова адрозніваўся ад папярэдняга антычнага і наступнага новачаснага горада. Геаграфічныя асаблівасці аказвалі пэўны ўплыў на развіццё рамяства ў асобных рэгіёнах. Напрыклад у Нідэрландах, парэйнскай Германіі і Францыі (Фландрыя, Шампань, Пікардыя, Тулуза) была развіта суконная справа. Металапрацоўка была развіта ў Парыжы, Страсбургу, Нюрнбергу, дабыча солі – у Правансе, Зальцбургу, а таксама на ўзбярэжжы Атлантычнага акіяну. Горназдабываючая справа была развіта на поўначы і захадзе Англіі, у Чэхіі, Аўстрыі, Швецыі.

У высокім і познім сярэднвеччы актыўна развіваўся гандаль. Буйнейшыя кірмашы знаходзіліся ў Таледа і Севлы ў Кастыліі, Парыжы, Марсэлю ў Францыі, Кёльне, Франкфурце, Вене ў Германіі. Побач з сухапутнымі актыўна выкарыстоўваліся марскія і рачныя гандлёвыя шляхі. Нягледзячы на панаванне ў Еўропе хрысціянства, у многіх краінах Еўропы існавалі свае асаблівасці летазлічэння і календара.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ